2 1

Мінск, 19 Ліпеня 1941

# ЗАГАД

1. Пачынаючы ад даты гэтага загаду, у гарадзе Менску будзе выдучана асобная частка гораду выключна на пражываньне жыдоў.

2. Усе жыдоўскае жыхарства гораду Менску абавязана пасьля абвяшчэньня гэтага загаду на працягу 5-ці дзён перабрацца ў жыдоўскі раён. Калі хто з жыдоў пасьля сканчэньня гэтага тэрміну будзе знойдзены ня ў гэтым жыдоўскім раёне, ён будзе арыштаваны і як настражэй пакараны.

3. Дапушчаецца браць с сабой хатнюю маёмасьць. Хто будзе злоўлены на забіраньні чужога дабра, будзе карацца праз расстрэл.

4. Жыдоўскі раён абмяжоўваецца наступнымі вуліцамі: Калгасны завулак з прыляганьнем Калгаснай вуліцы, далей лаўз рэчку з прыляганьнем Нямігскай вуліцы, выключаючы праваслаўную царкву, з пыляг. да Рэспубліканскай вуліцы, з прыляганьнем Шорная вул. Калектарнай вуліцы, Мэбельнага завулка, Перакапскай вуліцы, Нізавой вуліцы, Жыдоўских могілак, Ябутковай вуліцы, Другога Апанскага завулка, Заслаўскай вуліцы аж да Калгаснага завулка.

5. Жыдоўскі жылы раён мае быць пасьля сканчэньня пярэбараў агароджаны каменным мурам ад рэшты гораду. Мураваньне гэтага муру мусіць быць зроблена жыхарамі жыдоўскага раёну, прычым за будаўляны матэрыял будзе ісьці каменьне з няжылых або зруйнаваных будынкаў.

6. Бытаваньне ня ў жылым жыдоўскім раёне жыдом, заграмаджаным у рабочыя жыдоўскія дружыны, ёсьць забаронена. Гэтыя дружыны могуць выйсьці са свайго раёну толькі маючы накіраваньне на пэўныя месцы працы, вызначаныя Менскай Гарадзкой Управай. Парушэньне гэтага загаду будуць карацца праз расстрэл.

7. Жыдам дазволена ўваходзіць і выходзіць з жыдоўскага раёну толькі дзьвюма вуліцамі: Апанскай і Астроўскай. Пералазіць праз мур забараняецца. Нямецкай варце і варце Дапаможнай Грамадзянскай паліцыі загадана страляць у парушальнікаў гэтага.

8. У жыдоўскі жылы раён могуць уваходзіць адны толькі жыды і асобы, якія належаць да нямецкіх вайсковых фармаваньняў і да Гарадзкой Менскай Управы і толькі на выпадак справы.

9. На жыдоўскую раду ўскладзена пазыка 30.000 чырвонцаў на ўзнаўленьне выдаткаў, зьвязаных з гэтымі пярэбарамі. Гэтыя грошы, процантная аплата якіх пазней будзе ўрэгулявана, павінны быць зложаны на працягу 12 гадзін пасьля выдання гэтага загаду ў касу Гарадзкой Управы (вуліца Карла Маркса, 28).

10. Жыдоўская Рада зараз-жа павінна даць Аддзелу прыдзелу памешканьняў Гарадзкой Управы заяву пра ўсе жыдамі пакінутыя памешканьні, якія знаходзяцца ня ў жыдоўскім раёне і яшчэ не занятыя арыйскім (няжыдоўскім) жыхарствам.

11. Парадак у жыдоўскім жылым раёне будуць трымаць асобныя жыдоўскія дружыны парадку (асаблівы загад на гэта будзе сваім часам)

12. За канчатковыя пярэбары жыдоўскіх жыхароў у іхны раён поўную адказнасьць мае Жыдоўскае Рада гораду Менску. Усялякія парушэньні гэтага загаду будуць як найстражэй пакараны.

ПАЛЯВЫ КОМЕНДАНТ.